Цяпер, як і заўсёды, камсамол захоўвае бязмежную адданасць Камуністычнай партыі, высокую гатоўнасць па першаму яе закліку ісці на самыя складаныя, цяжкія ўчасткі. Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза выказвае цвёрдую ўпэўненасць у тым, што дзевятнаццацімільёны камсамол, які ідзе ў авангардзе маладых будаўнікоў камунізма, сваёй натхнёнай працай упіша новыя гераічныя старонкі ў гісторыю барацьбы за перамогу камунізма, за трыумф ідэй Маркса, Энгельса, Леніна, будзе і ў далейшым нястомна выхоўваць камсамольцаў, усіх савецкіх юнакоў і дзяўчат у духу бязмежнай адданасці справе партыі, справе камунізма.

(З ПРЫВІТАННЯ ЦК КПСС XIV З'ЕЗДУ ВЛКСМ).

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 14 (484) | Серада, 18 красавіка 1962 г. | Цана 1 кап.



На здымку: студэнты 4 курса матфака Віктар Краўцоў і Вячаслаў Куклін за работай у вылічальным цэнтры універсітэта.

## У ДОБРЫ ЧАС, СЯБРЫ!

Паслязаўтра пачынаецца размеркаванне маладых спецыялістаў — выхаванцаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Будзе рашацца лёс 488 выпускнікоў усіх васьмі факультэтаў. Уласна кажучы, гэтыя дзяўчаты і юнакі вырашылі свой лёс яшчэ пяць гадоў таму назад, калі яны прыехалі ў прыгажун Мінск і трымалі першыя экзамены.

Экзаменатары, якія прывыклі бачыць раней перад сабой учарашніх школьнікаў з іх юнацкай непасрэднасцю, хваляваннем, у той год упершыню сустрэліся з вялікай арміяй людзей, умудроных жыццёвым вопытам, якія праверылі ўжо свае адносіны да выбранай спецыяльнасці і цяпер цвёрда і ўпэўнена адказвалі на пытанні экзаменатараў.

Пяць год студэнцкага жыцця праляцелі непрыкметна. Якіх толькі падзей не было за гэты час! Працалюбівыя рукі нашых студэнтаў дапамагалі цалiннiкам Казахстана ўбіраць багатыя ураджаі. Дзесяткі гадзін плённай працы — вось уклад многіх цяперашніх пяцікурснікаў у будаўніцтва галоўнага корпуса. Шмат гадзін правялі студэнты і на будаўніцтве інтэрната па вуліцы Дзімітрава.

Але галоўнае для студэнта — вучоба. І максімум часу аддавалася менавіта ёй. На гістфаку усе ведаюць удзельніцу танцавальнага гуртка Святлану Сіманькову і ведаюць таксама, што ў яе залікоўцы не знойдзеш адзнакі, меншай за «пяцёрку». На хімічным факультэце вучыцца Уладзімір Каханоўскі. Пяць год ён працаваў над вывучэннем фатаграфічных уласцівасцей суасаджаных ацэціленіда і хларыда серабра. І за ўсе пяць год ніводзін экзаменатар не мог паскардзіцца на дрэнныя адказы Уладзіміра. На філалагічным факультэце займаецца выдатніца вучобы Марыя Верамейчык. Яе ўпартасці ў вучобе і ў спорце можа пазайздросціць кожны. Не ўсім жа даецца такая цяжкая справа, як устанаўленне рэкорда рэспублікі па лёгкай атлетыцы.

Пасля першамайскага свята — 3 мая — усе выпускнікі будуць ведаць, дзе яны будуць працаваць: у школе ці ў пракуратуры, на заводзе ці ва ўстанове. Па сутнасці, гэта не так важна, дзе яны будуць працаваць. Яны ж пойдуць туды, дзе больш за ўсё патрэбны менавіта іх маладыя, працавітыя рукі, дзе больш за ўсё патрэбны іх веды, уменне.

Трэба спадзявацца, нашы выпускнікі прыкладуць усе намаганні, каб не страціць славу выхаванцаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

У добры час, дарагія сябры!

* * *

На здымку: выпускніца філфака Марыя Верамейчык.



## ГРАФІК
### размеркавання маладых спецыялістаў

З прыказа рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

□

20 красавіка—юрыдычны факультэт.

21 красавіка—хімічны факультэт.

23 красавіка—фізічны факультэт.

24 красавіка—матэматычны факультэт.

25 красавіка — біялагічны факультэт.

26 красавіка — гістарычны факультэт.

27 красавіка —геаграфічны факультэт.

29 красавіка—аддзяленне рускай мовы і літаратуры.

30 красавіка — аддзяленне беларускай мовы і літаратуры.

3 мая — аддзяленне журналістыкі.

## Пачалася абарона дыпломных

*У панядзелак на геаграфічным факультэце пачалася абарона дыпломных работ выпускнікоў. Як нам паведаміў дэкан факультэта дацэнт І. І. Трухан, у гэты дзень абаранялася 6 студэнтаў. Пяцёра з іх — Тамара Ламец, Леаніда Змачынская, Лідзія Гірыловіч, Лілія Бахар, Людміла Горбель — атрымалі выдатныя адзнакі, а Міхаіл Багдановіч — добрую.*

*Учора пачалася абарона дыпломных работ таксама на гістарычным факультэце, а на філалагічным факультэце адбылося ўжо некалькі пасяджэнняў дзяржаўнай камісіі, на якіх праводзілася абарона дыпломных работ.*

## Матэматычны аналіз—цікавы прадмет!

Больш года прайшло з таго часу, калі закончылася першая, памятная на ўсё жыццё, сесія. Але ўсё роўна хвалюемся мы перад наступаючымі экзаменамі. Некаторыя ж прадметы нам чытаюць апошні семестр!

Напрыклад, канчаем мы курс матэматычнага аналізу, які чытае нам Юрый Станіслававіч Багданаў. Цяжка было ад прывычных школьных сінусаў і косінусаў перайсці да тэорыі сапраўдных лікаў, да паняццяў вытворных і інтэграла. Першая ж тэарэма па матэматычнаму аналізу Дэдэкінда аб шчыльнасці мноства сапраўдных лікаў здавалася ўвогуле неправдападобнай. Мы не маглі так адразу зрабіць рэзкі пераход ад элементарнай матэматыкі да вышэйшай.

І вось адна лекцыя пачалася даволі незвычайна. Юрый Станіслававіч раіўся з намі, пытаў, як лепш яму чытаць лекцыі, каб мы лепш засвойвалі. Пасля таго у нас кожную суботу праводзіліся калёквіумы, кансультацыі, і пачаў работаць навуковы гурток. Асабліва вялікую дапамогу аказалі нам калёквіумы.

Яны праходзілі прыкладна так. Выкладчык выпісваў пытанні, і студэнты па жаданню адказвалі на іх. Потым пачыналася абмеркаванне адказаў.

Плённа праходзяць практычныя заняткі. Вось адзін з заняткаў:

— Сёння мы бяром новую тэму: «Раскладванне функцый у рад Фур'е», — гаворыць Юрый Станіслававіч.

Ён выпісвае нумары практыкаванняў, якія неабходна рашыць, напамінае неабходныя для заняткаў формулы і паняцці. Адзін за адным выходзяць студэнты да дошкі і рашаюць найбольш цяжкія прыклады. Калі студэнт ля дошкі не здолее рашыць прыклад, яму дамапагаюць таварышы. Хутка пралятаюць 90 хвілін.

Вось і званок.

— Прыклады, якія не рашылі, як заўсёды, на дом... Ну, а як у вас справы з іншымі прадметамі? — цікавіцца на перапынку Юрый Станіслававіч. Мы дзелімся з ім сваімі няўдачамі і радасцямі, расказваем аб сваім жыцці.

Вялікую работу вядзе навуковы гурток. Там распрацоўваюцца самыя разнастайныя тэмы па матэматычнаму аналізу і дыферэнцыяльным ураўненням. На рэспубліканскім аглядзе навуковыя работы студэнтаў І. Журбенка і Л. Трэгубовіча атрымалі 2 катэгорыю. Яны ўдзельнічалі таксама у VIII студэнцкай навукова-тэхнічнай канферэнцыі Прыбалтыкі і Беларусі.

**Н. СУБАЧ,**
**студэнтка 4 групы 2 курса матфака.**

## Адэса, Адэса...

Ці даўно захапляліся мы кнігамі пра славутыя катакомбы? Ці даўно мы, тады яшчэ басаногія падшыванцы, нацягнуўшы на самыя вочы брылі шапак, засунуўшы рукі ў кішэні, цадзілі скрозь зубы: «Я не расскажу про всю Одессу...»?

І вось цяпер мы бачым цябе зблізку. І ты аказалася светлай, радаснай — зусім не такой, як у тых кнігах; прыветлівай, чыстай— не такой, як у той песні.

Ад цябе мы прывезлі дадому поўныя сэрцы сонечных успамінаў. Студэнцкія навуковыя канферэнцыі, на якой нам — Таісе Сіняк (біяфак), Колю Сакалоўскаму (геафак), Софе Лібкінд (філфак) і мне — выпала шчасце быць, назаўсёды застанецца ў нашай памяці. Дарагія нашы сябры, члены камітэта камсамола і савета СНТ Адэскага універсітэта! Гэта вы стараліся не даць нам сумаваць, стараліся паказаць свой горад, паказаць яго прыгажосць.

Пасяджэнні секцый заканчваліся вечарамі. І тады мы — пасланцы розных ВНУ, дзеці розных народаў — хадзілі па Прыморскім бульвары, да поўначы любаваліся агнямі горада. І кожны раз цішыню парушалі цудоўныя гукі песен. Спявалі і «Падмаскоўныя вечары», і «Суліко», і «Верхавіну». А ты помніш, грузін Гурам, як, не ведаючы нават слоў, з запалам працягваў ты «Ой, бярозы ды сосны», альбо мілагучную «Толькі з табою»?

«Мне вельмі падабаецца ваша мова. Яна такая пахучая, шчырая, у ёй столькі колераў! Шануйце яе!» — гэта сказаў выкладчык украінскай літаратуры універсітэта Канстанцін Яўхімавіч Данілка.

«Новую зямлю» Якуба Коласа я чытала нават чатыры разы: раз — на рускай мове, раз — на украінскай і два — на беларускай. Кожны раз да мяне сабіраліся суседзі і прасілі чытаць яшчэ і яшчэ», — не магла не падзяліцца ўражаннямі аб паэме Анна Іванаўна Бутэлька, студэнтка-завочніца з горада Ізмаіла. Яна заканчвае універсітэт. Назва яе дыпломнай работы — «Тэма працы ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля».

Так, на ўсё жыццё мы запомнім цябе, паўднёвы горад. І калі каму-небудзь з нас доўгімі зімовымі начамі будзе сніцца то зялёная, то сіняя сурвэта Чорнага мора, ведай, Адэса: гэта зрабіла ты! І калі нам — мілая львавянка Таня, рыжскі весялун Андрэс, тбілісец Гурам — давядзецца сустрэцца зноў і, як старым сябрам, моцна паціснуць адзін аднаму рукі, ведай, Адэса, што гэта таксама зрабіла ты!

**В. РАГОЙША,**
**4 курс філфака.**

## У ЭСТОНСКІХ СЯБРОЎ

У Тарту упершыню была праведзена міжвузаўская студэнцкая канферэнцыя гуманітарных навук. Была на канферэнцыі і дэлегацыя нашага універсітэта ў складзе 6 студэнтаў. Поезд яшчэ не спыніўся, але мы праз вокны ўжо віталі нашых эстонскіх сяброў.

Канферэнцыя гуманітарных навук праходзіла ў дзелавой сяброўскай абстаноўцы. У ёй прынялі ўдзел студэнты Вільнюса, Рыгі, Таліна, Шауляя, Даугаўпілса, Горкага, Пскова, Мінска. Было прачытана каля 60 дакладаў на розныя тэмы. Усе даклады ў тоў ці іншай ступені былі звязаны з сучаснасцю. Найбольш цікавыя з іх — даклады студэнта 5 курса Даугаўпілскага педінстытута Х. Фёдарава «Аб некаторых асаблівасцях драматургіі Бертольда Брэхта», студэнткі 3 курса Тартускага універсітэта А. Трумер «Пытанне аб адносінах да класічнай спадчыны ў дарэвалюцыйнай паэзіі Ул. Маякоўскага», студэнта 3 курса юрыдычнага факультэта БДУ В. Каханоўскага «Умоўна-датэрміновае вызваленне з месц заключэння». Працавалі 9 секцый: педагогікі, гісторыі, эстонскай літаратуры і фальклора, рускай літаратуры і літаратуры народаў СССР і інш.

Не сакрэт, што студэнцкія навуковыя работы атрымоўваюць не толькі прызнанне вучоных саветаў, але і прымяненне ў жыцці. У прыватнасці, работа студэнта Пскоўскага пединстытута У. Анціпава «Артыкулы В. Г. Караленка, прысвечаныя здзекванням над палітзняволенымі ў Пскоўскім цэнтрале» атрымала высокую адзнаку на канферэнцыі і была рэкамендавана да друку.

На апошнім пленарным пасяджэнні ў кафэ «Студэнцкім» нашы сябры з Эстоніі вельмі чула, па-сяброўску гаварылі аб умацаванні сяброўскіх сувязей паміж нашымі універсітэтамі.

**А. СТРЫЖЭВІЧ.**

## ДАКЛАДЫ ДЛЯ РАБОЧЫХ

Кафедра гісторыі філасофіі і логікі арганізавала для рабочых Мінскага аўтазавода чытанне дакладаў па тэмы аб фарміраванні камуністычных грамадскіх адносін. Кожны панядзелак на прадпрыемствы выязджаюць супрацоўнікі кафедры. Асабліва добрае ўражанне ў рабочых пакідаюць выступленні выкладчыкаў А. М. Паўлючэнкі, А. С. Кляўчэні, аспірантаў Ражкова, Жураўлёва.



На здымку: выкладчыца рускай літаратуры 33 школы Мінска Любоў Іванаўна Воранава абмяркоўвае з практыкантам—студэнтам 4 курса філфака Рычардам Чарлёнкам праведзены ім урок.

Фота Э. ДАМАРАЦКАГА

# Шчодрая душа

Калі вы спытаеце студэнта матэматычнага факультэта, якая рыса найбольш характэрная для Арона Міхайлавіча Родава, кожны адкажа — чуласць. І тут жа дапоўніць — дабрата, бескарыснасць. Куды б ні спяшаўся, куды б не ішоў Арон Міхайлавіч, ён заўсёды знойдзе час, каб пагутарыць з тым, хто да яго звернецца. Хай гэта будзе пытанне па матэматыцы, хай по асабовай справе — Арон Міхайлавіч будзе гутарыць з вамі да таго часу, пакуль вы зразумееце, атрымаеце адказ поўны і змястоўны.

Гутарка ў самым разгары, калі званок абвяшчае аб пачатку лекцыі. І ўсе разам — выкладчык і студэнты заходзяць у аўдыторыю. Пачынаецца лекцыя.

Пачынаецца яна і для дацэнта Родава. На матэматычным факультэце ён вядзе курс па функцыянальнаму і матэматычнаму аналізу на базе сучасных дасягненняў. Пасля тэарэтычнай часткі заўсёды праводзяцца практычныя заняткі. І тое, што яны праходзяць змястоўна, ажыўлена як на стацыянары так і на вячэрнім факультэце гаворыць аб тым, што Арон Міхайлавіч ведае і любіць свой прадмет. Гэтага ён дабіваецца і ад студэнтаў.

Арон Міхайлавіч упэўнен, што задача ўцягнення большасці студэнтаў у плённую навукова-даследчую работу можа быць вырашана толькі намаганнямі саміх выкладчыкаў. І таму ён зусім нядаўна на грамадскіх пачатках пачаў чытаць спецкурс па матэматычнаму і функцыянальнаму аналізу. Кожную пятніцу з 3 да 5 гадзін яго кожны знойдзе перад аўдыторыяй студэнтаў, аспірантаў розных кафедр матэматычнага факультэта і работнікаў інстытута матэматыкі Акадэміі навук БССР. Ужо ён прачытаў лекцыі па такіх тэмах, як «Метрычныя прасторы», «Прасторы Гільберта» і іншыя.

К. ІСКРА,
Н. ШЧАДРОВА.

# Старэйшы сябра студэнтаў

Гэты сціплы і чулы чалавек заслужана карыстаецца павагай студэнтаў і выкладчыкаў. Яго ведае кожны студэнт на факультэце, бо першае знаёмства з хіміяй пачынаецца дзякуючы яму.

На першым курсе мы слухаем яго захапляючыя і змястоўныя лекцыі. Вадзім Васільевіч Свірыдаў заўсёды расказвае аб навуковых навінках, аб адкрыццях у той ці іншай галіне хіміі. Не дзіўна таму, што гурток неарганічнай хіміі, якім ён кіруе, адзін з шматлікіх на факультэце.

Вадзім Васільевіч вельмі шмат увагі ўдзяляе сваім выхаванцам. Ён многа і ўпарта працуе над вывучэннем праблем хіміі, і гэта атмасфера творчасці і энергіі, з якой ён бярэцца за любую справу, знаходзіць жывы водгук ва ўсіх людзей, якія акружаюць яго.

Вадзім Васільевіч шмат працуе ў таварыстве па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў. Не было выпадку, калі б, заняты сваёй шматграннай педагагічнай, навуковай і грамадскай дзейнасцю, ён не знайшоў часу для таго, напрыклад, каб напісаць заметку ў бюлетэнь СНТ ці проста дапамагчы чалавеку.

Група студэнтаў хімфака.

*АГЛЯД ДРУКУ*

# Павучыцца ёсць чаму

— Цікава наша газета!— дачытаўшы апошнія радкі насценнай газеты **«За мічурынскую біялогію»**, сказаў студэнт першага курса Леанід Мыцько.

Апошні нумар сапраўды цікавы. Тут можна прачытаць аб унутраным жыцці факультэта, аб вучобе і адпачынку студэнтаў, аб рабоце агітбрыгад, аб маральным абліччы нашых студэнтаў і аб многім іншым.

У заметцы Н. Кугеля «Плады самастойнасці» расказваецца аб тых студэнтах, якія добраякасна ўбіраць замацаваныя за імі аўдыторыі і лабараторыі. Тут жа крытыкуюцца студэнткі Кільчэўская, Рыжанкова, Кавальчук, Рабчэўская за недабрасумленныя адносіны да сваіх абавязкаў.

Характэрна тое, што рэдкалегія дабіваецца рэагавання на кожнае выступленне газеты. Крытычныя заметкі абмяркоўваюцца на камсамольскіх сходах, на вучоным савеце факультэта. Вось і ў гэтым нумары змешчан адказ старшыні вучонага савета П. Г. Пятровіча на заметку студэнткі 4 курса З. Ягудкінай, у якой крытыкавалася дрэнная арганізацыя вучэбнай практыкі студэнтаў. Заметку абмяркоўваў вучоны савет, і крытыка прызнана правільнай. Тав. Пятровіч расказвае аб мерах, якія вырашана прыняць для паляпшэння вучэбнай практыкі.

Спадабаўся нам нумар газеты, прысвечаны 40-годдзю універсітэта. Рэдкалегія папрасіла выступіць у газеце былых выпускнікоў біялагічнага факультэта, якія працуюць цяпер у розных кутках нашай краіны.

Змяшчаць цікавы матэрыял, шукаць новыя формы падачы яго — вось чым кіруецца рэдкалегія ў сваёй рабоце. На старонках газеты пастаянна можна ўбачыць рубрыкі «Па белу свету», «Біяфак вячэрні», «Лісткі з феналагічнага каляндара», «Па слядах нашых выступленняў» і іншыя. Гэта дапамагае чытачу хутчэй адшукаць патрэбны матэрыял.

— Два разы ў месяц мы збіраемся на лятучку, — расказвае намеснік рэдактара Леанід Грачоў. — На іх мы абмяркоўваем папярэдні нумар і плануем наступны, размяркоўваем, хто і якія матэрыялы рыхтуе.

Многаму можна павучыцца ў рэдкалегіі насценнай газеты біялагічнага факультэта. Хацелася б, каб рэдкалегіі іншых факультэтаў пераймалі ўсё лепшае і укаранілі ў сваю практыку.

М. ЯКІМЧЫК.

# Донжуан з Мядзельшчыны

*Аб тым, што Станіслаў Каліцкі любіць прыгоды, ведаюць не толькі на Мядзельшчыне. Такая ўжо ў яго натура: хлебам не кармі, а дай чалавеку пазабаўляцца, пахадзіць, як кажуць, на галаве.*

*У вёску Нагаўкі, дзе Каліцкі працаваў выкладчыкам, прыехалі маладыя супругі, настаўнікі Іван Міхайлавіч і Анісся Іванаўна Вялі. На кватэру сталі ў пажылых калгаснікаў, і тыя абрадаваліся маладым людзям, як родным дзецям, зайздросцілі іх згодзе, любаваліся на іх, успаміналі сваю даўно мінуўшую маладосць. Цешыліся ладам і згодай Івана Міхайлавіча з Аніссяй Іванаўнай і суседзі.*

*Толькі Каліцкі не мог спакойна глядзець на чужое шчасце, хоць і вельмі блізка сыйшоўся з сям'ёй Вяляў. Аднойчы, калі гаспадара не было дома, Каліцкі прыняў выгляд самага няшчаснага на зямлі чалавека і бразнуўся ніц перад Аніссяй Іванаўнай:*

*— Родная, мілая Анісся! Я кахаю цябе! Кахаю на ўсё жыццё! Цябе, толькі адну цябе! Пашкадуй мяне, не мучай!*

*Кажуць, што кропля камень точыць. Так здарылася і з Аніссяй Іванаўнай. Яна засумнявалася:*

*— А ці шчаслівая я з Іванам Міхайлавічам?*

*— Не, не і не! — лепятаў на самае вуха Каліцкі. — Толькі са мною!*

*— А ці падыходзіць мне Іван Міхайлавіч?*

*— Толькі я,—расплываўся Станіслаў. — Ты будзеш шчаслівай, любая! Я так буду цябе кахаць!*

*Хутка ў сям'і Вяляў запахла скандаламі, справа дайшла да суда.*

*— Хохмачкі! — цешыцца Станіслаў. — Справа зроблена! Шукай, Анісся Іванаўна, ветру ў полі.*

*І ў той час, калі ў нарсудзе слухалася справа аб скасаванні шлюба Вяляў, Каліцкі не драмаў у шапку. Ён выбіраў сабе новую ахвяру. Ёй аказалася маладая настаўніца Зінаіда Сяргееўна Шарамет. Не змагла яна ўстаяць перад чароўнымі словамі Каліцкага.*

*І хоць на вёсцы пра Станіслава ніхто не мог сказаць добрага слова —Зіна паверыла, паверыла, так, як можа паверыць той, хто гатоў дзяліць з любым усё: і радасць, і гора, і смутак, і шчасце.*

*Калі ж адносіны з Зінай зайшлі вельмі далёка, Каліцкі сцяміў:*

*— Пара зматваць вуды, а то і падгарэць можна.*

*На справе гэта азначала — перавесціся з завочнага аддзялення на стацыянар. Сказана — зроблена. І вось Каліцкі—студэнт 3 курса беларускага аддзялення філфака. Назад у Нагаўкі яго і на вяроўцы не зацягнеш.*

*Але Зіна, не дачакаўшыся свайго «суджанага», прыехала ў Мінск сама.*

*— Я хутка буду маці, Стасю!— з радасцю паведаміла яна.*

*— Што-о-о? — вочы Каліцкага зрабіліся квадратнымі.—Ты маеш розум? Зрабі што-небудзь, пакуль не позна.*

*Куды дзеліся нядаўнія пяшчота і шчырасць. Перад Зінай стаяў раз'юшаны, агідны і зусім чужы чалавек.*

*А Каліцкі адчуў, што не мінаваць навальніцы, і зрабіў спробу замесці сляды. Пад покрывам ночы, ўвабраўшы галаву ў плечы, прабіраўся ён да вёскі.*

*Так жа асцярожна выходзіў і з вёскі. План удаўся. Дубраўская і Ферковіч будуць сведчыць у карысць Каліцкага.*

*Але дарэмна спрабаваў замятаць сляды Каліцкі, дарэмна рабіў вялікія вочы і ў дэканаце, і на камсамольскім сходзе. На гэты раз яго «артыстычныя здольнасці» не дапамаглі.*

*Гадзюкай круціцца Каліцкі, хапаецца за кожную дробязь:*

*— Не вінаваты я. Не дакажаце, што дзіця мае. Не маеце падстаў.*

*Сказаў гэта спакойна, абыякава, быццам справа ішла не аб будучым дзіцяці, а аб пераблытаных у гардэробе галёшах. Цікава, адкуль такое ў чалавека, які збіраецца стаць выхавацелем? Ці ж мае ён, урэшце, на гэта права?*

*Не хацеў адказваць Каліцкі за свае ўчынкі, не знаходзіў смеласці прызнацца ў факце сваіх агідных паводзін. Гэта зрабіў за яго камсамольскі сход. Каліцкі панёс заслужанае пакаранне. Хай яно стане ўрокам для тых, хто яшчэ, падобна Каліцкаму, лічыць донжуанства мэтай свайго жыцця.*

Л. КУЗЬМІЦКІ,
В. ЖВАЛЕЎСКІ.

## *Пасля таго, як выступіла газета*

У газеце «Беларускі універсітэт» № 9 быў апублікаван агляд друку «Цікава, едка? Не!», у якім крытыкавалася работа рэдакцыйнай калегіі насценнай газеты «Слова філолага». Пасля таго, як выступіла шматтыражная газета, рэдкалегія «Слова філолага» абмеркавала гэты матэрыял і звярнулася да чытачоў за парадай, якія меры неабходна прыняць для паляпшэння газеты, якія тэмы больш за ўсё хвалююць іх, якія матэрыялы жадаў бы чытач бачыць на старонках «Слова філолага».

# Сустрэча шашыстаў



Адбылася таварыская сустрэча юных шашыстаў Мінскага палаца піянераў з камандай універсітэта. Гульні праводзіліся на 20 дошках. У сустрэчы прынялі ўдзел чэмпіёнка БССР сярод жанчын Людміла Лесіна, майстар спорту Марат Гелер і іншыя.

Сустрэча закончылася з лікам 11,5:8,5 у карысць шашыстаў універсітэта. Цікавай была сустрэча асістэнта хімічнага факультэта першаразрадніка Мікалая Рафальскага з вучнем 6 класа 30 сярэдняй школы Іосіфам Марголіным. Школьнік аказаўся пераможцай. Выйгралі таксама вучні Анатоль Затучны, Дзіма Сухарукаў і іншыя.

Студэнты універсітэта з вялікай цікавасцю правялі сустрэчу з піянерамі і адзначылі высокае майстэрства іх гульні.

На здымку: гуляюць Валерый Мартыненка, член шашачнага гуртка Палаца піянераў, і майстар спорту Марат Гелер.

Тэкст і фота Л. СЯНЮТЫ.

# *Калі група дружная*

**Жыццё факультэта, курса, групы ў многім залежыць ад таго, як пастаўлена там камсамольская работа.**

**У нас, на 1 курсе матэматычнага факультэта, часта праводзяцца дыспуты, экскурсіі, гутаркі. Доўга, напрыклад, не змаўкалі спрэчкі аб вершах Сяргея Ясеніна.**

**Ужо стала законам—пасля кожнага калектыўнага наведвання кіно або тэатра абмяркоўваць прагледжаны фільм ці спектакль. Паглядзелі, напрыклад, кіно «Наш агульны сябра» ці спектакль тэатра імя Янкі Купалы «Паўночная мадонна», і зноў на перапынках не змаўкаюць размовы.**

**Усе групы курса правялі экскурсіі ў мастацкі музей, і гэта, канешне, усім вельмі спадабалася.**

**Але нельга ўмаўчаць і аб недахопах.**

**Ёсць у нас яшчэ студэнты, у прыватнасці, Петрачэнка, Абрашын, якія зусім не цікавяцца камсамольскім жыццём. На іх перш за ўсё патрэбна звярнуць увагу ўсяму нашаму актыву. Але такіх студэнтаў у нас становіцца ўсё менш і менш.**

**Планы ў нас вялікія. Зараз, напрыклад, мы рыхтуем сход «Мы і наша будучыня». А ў адзін з нядзельных дзён, як толькі стане пацяплей, мы рашылі правесці прагулку на ўлонне прыроды.**

Ю. ГРОМАК.

# Аб гульні нашых баскетбалістаў

Гледзячы на выступленні нашых баскетбалістаў на занальным першынстве БССР сярод ВНУ, многія балельшчыкі былі расчараваны. Ні мужчынская, ні жаночая каманда не выйшлі ў фінал, хаця ад мужчынскай каманды ўсе чакалі большага. Вельмі паказальна ў гэтых адносінах першая гульня нашай мужчынскай каманды з баскетбалістамі політэхнічнага інстытута. Першая палова і некалькі хвілін другой праходзяць з перавагай нашых хлопцаў. Балельшчыкі бурна рэагуюць на кожны закінуты мяч. І вось... Каманду нібы падмянілі. Лік хутка скарачаецца, а затым пачынае павялічвацца не ў карысць нашай каманды. Такі фінал для гаспадароў пляцоўкі, якіх мы лічым нічуць не слабей за «праціўнікаў», не можа не насцярожваць. У рашаючы момант каманда не знайшла ў сабе сілы, каб утрымаць да канца перавагу ў выніку чаго прайграла сустрэчу, ад якой у многім залежыў выхад у фінал.

Не збыліся надзеі балельшчыкаў і ў другі дзень. Сустрэчу каманда зноў прайграла. Але наступныя два матчы нашы баскетбалісты гулялі добра. У выніку— пятае месца.

Мы, улічваем узросшы ўзровень гульні ўсіх каманд і, параўноўваючы гульні нашай каманды з іншымі, маем надзею на лепшае будучае. І ёсць чаму. Як мужчынская, так і жаночая каманды складзены ў асноўным са студэнтаў 1—3 курсаў. Да таго ж у каманду прыйшоў новы трэнер Г. М. Груда, які прынёс з сабою новыя метады і планы трэніровак. І ўжо цяпер заметны прагрэс каманды. Ад гульні да гульні нашы хлопцы і дзяўчаты гуляюць лепш і лепш. Гэты прагрэс дазваляе мець надзею на лепшую гульню ў будучым.

Хочацца, каб і далей расшыраліся спартыўныя сувязі нашых баскетбалістаў з камандамі іншых ВНУ страны. Гэта ў многім будзе садзейнічаць росту майстэрства нашай каманды. Мы хочам верыць у тое, што нашы баскетбалісты будуць прыносіць нам усё менш непрыемнасцей.

Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212, тэл. 2-07-19. *Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР.* АТ 09946. Зак. 963. Т. 2000. **Нам. рэдактара А. ВОЛК.**